Бл. Цэліна Бажэнцкая: заступніца сясцёр змёртвыхпаўстанак

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
21.10.2018 00:00



Спалучыла ў сваёй біяграфіі сямейнае жыццё з манаскім, становячыся своеасаблівым феноменам у гісторыі Касцёла. Была жонкай, мамай, бабуляй і манахіняй. Заснавала Кангрэгацыю Сясцёр Змёртвыхпаўстання Пана Нашага Езуса Хрыста. Пакорная Божай волі

Цэліна Разалія Леанарда нарадзілася 29 кастрычніка 1833 года ў заможнай сям'і Хлюдзінскіх у Антовілі каля Оршы ў Беларусі. Дзякуючы клопату бацькоў атрымала добрую адукацыю. Ужо будучы маладой дзяўчынай хацела ўступіць у кляштар сясцёр візітак у Вільнюсе (Літва), але, паслухмяная волі бацькоў і парадзе спаведніка, у 1853 годзе выйшла замуж за Юзафа Бажэнцкага, уласніка маёнтка Абрэмшчына каля Гродна. † Гэта было шчаслівае сужэнства. Цэліна была адданай жонкай і маці. Нарадзіла 4-ых дзяцей, 2-ое з якіх – Марыя і Казімір – памерлі ў маленстве. Жывымі засталіся 2 дачкі – Цэліна і Ядзвіга. Перажывала моцны боль пасля страты маці і сястры. Усё гэта здарылася ў першыя гады замужжа.

Часам выпрабавання для Цэліны стала цяжкая хвароба мужа. У 1869 годзе Юзаф Бажэнцкі, закрануты паралічом, страціў сілу ў нагах. Уся сям'я вырушыла ў Вену (Аўстрыя) у пошуках эфектыўных метадаў лячэння. Верная жонка клапатліва апекавалася мужам на працягу 5-ці гадоў хваробы. Юзаф памёр у 1874 годзе.

Пасля смерці мужа Цэліна вярнулася да дзявочых мар пра манаства. У хуткім часе разам з дачкой Ядзвігай склала манаскія абяцанні. Пад уплывам ксяндзоў змёртвыхпаўстанцаў заснавала жаночую Кангрэгацыю Сясцёр Змёртвыхпаўстання Пана Нашага Езуса Хрыста, якая была зацверджана Касцёлам у студзені 1891 года. Інстытут заняўся вядзеннем школ, дзіцячых садкоў, інтэрнатаў. Сёстры з Кангрэгацыі распачалі

служэнне як настаўніцы, выхавацельніцы, катэхеткі, закрыстыянкі, арганісткі, аніматары аазісаў, медсёстры.

1906 год стаў для маці Цэліны чарговым выпрабаваннем. Нечакана памерла яе дачка Ядзвіга, сузаснавальніца Кангрэгацыі і найбліжэйшая супрацоўніца, якая павінна была далей весці распачатую справу. Аднак жанчына пакорна падпарадкавалася Божай волі, працягваючы аддана выконваць абавязкі генеральнай настаяцельніцы.

Памерла ў Кракаве (Польшча) 26 кастрычніка 1913 года. Была пахавана ў Кэнтах, побач з дачкой. У 1937 годзе тленныя парэшткі Цэліны і Ядзвігі былі перанесены ў склеп пад капліцай манастыра сясцёр змёртвыхпаўстанак, а ў 2001 годзе – у саркафаг у касцёле св. Маргарыты і св. Кацярыны.

27 кастрычніка 2007 года ў рымскай базіліцы св. Яна на Латэране маці Цэліна Бажэнцкая была абвешчана бласлаўлёнай.

Чаму можам навучыцца ў бл. Цэліны?

Бласлаўлёная з’яўляецца прыкладам святасці і вернасці ў выкананні Божай волі з усёй пакорай і гатоўнасцю, у стане глыбокай малітвы. Яе асоба – узор годнага перажывання цярпення ці страты кагосьці блізкага.

Цікава!

Пасля малітвы праз заступніцтва бл. Цэліны невытлумачальным чынам паправіўся цяжка паранены ў аварыі Анджэй Мехежыньскі-Віктар, праўнук бласлаўлёнай у 5-ым пакаленні. У 2002 годзе ватыканская Кангрэгацыя па справах кананізацыі афіцыйна прызнала гэты цуд.

З вуснаў бласлаўлёнай

“Няма рэчы, якой бы душа з любові да Пана Езуса не вытрымала”.

Літургічны ўспамін

Касцёл узгадвае бл. Цэліну Бажэнцкую 26 кастрычніка.